3-12

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ
ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА І ЯНКІ КУПАЛЫ

УДК 81'282=161.3

**ЗАБАШТАНСКАЯ
АКСАНА ІГАРАЎНА**

# НЕРЭГУЛЯРНЫЯ ФАНЕТЫЧНЫЯ З'ЯВЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯЛЕКТНАЙ МОВЕ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Навукова-
бібліяграфічны
аддзел

Мінск, 2008

Установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М.Машэрава»
НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

81.411.3-3я031
З-12

Работа выканана на кафедры беларускага мовазнаўства УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

Навуковы кіраўнік – **Міхайлаў Павел Аляксандравіч,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры,
УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка",
кафедра беларускага мовазнаўства

Афіцыйныя апаненты – **Даніловіч Мікалай Аляксандравіч,**
доктар філалагічных навук, прафесар,
загадчык кафедры,
УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы",
кафедра беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства

**Кунцэвіч Любоў Пятроўна**, кандыдат філалагічных навук, намеснік дырэктара па навуковай рабоце, ДНУ "Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі"

*20504039*

Апаніруючая арганізацыя – Беларускі дзяржаўны універсітэт

Абарона адбудзецца 23 снежня 2008 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.43.01 пры ДНУ "Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1 корп. 2, тэл. 284-18-85, e-mail: inlinasbel@tut.by).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтарэферат разасланы 22 лістапада 2008 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат філалагічных навук Паляшчук Н. В.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Сучасны этап развіцця айчыннай дыялекталогіі адметны тым, што на працягу папярэдніх двух стагоддзяў было назапашана дастаткова фактычнага матэрыялу і зроблена сістэмнае апісанне і даследаванне беларускага дыялектнага ландшафту. У апошнія дзесяцігоддзі ў лінгвістычнай навуцы ўзнікла патрэба даследаваць не толькі рэгулярныя, пазіцыйна абумоўленыя, уласцівыя літаратурнай ці дыялектнай мове фанетычныя з'явы, але і нерэгулярныя, або асістэмныя. З выхадам пяцітомнага "Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак" (ЛАБНГ)[1] у мовазнаўцаў з'явіліся выключна спрыяльныя ўмовы для комплекснага і дэталёвага вывучэння разнастайных гукавых змен у беларускай дыялектнай мове.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне выканана ў межах тэмы "Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння" (№ 20062334), якая распрацоўваецца на кафедры беларускага мовазнаўства УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" і ўваходзіць у Дзяржаўную праграму фундаментальных даследаванняў "Беларуская мова і літаратура ў гістарычным развіцці і сучасным грамадстве, іх узаемасувязі і ўзаемадзеянне з іншымі мовамі і сусветным літаратурна-мастацкім працэсам" (2006 – 2010) гг.

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта дысертацыйнага даследавання – выявіць, сістэматызаваць і апісаць нерэгулярныя фанетычныя з'явы ў беларускай дыялектнай мове. Дасягненне пастаўленай мэты патрабуе вырашэння наступных задач:

– ахарактарызаваць нерэгулярныя фанетычныя з'явы ў дыялектнай мове як навуковую праблему, даць вызначэнне тэрміна "нерэгулярная фанетычная з'ява" і распрацаваць методыку адбору і апісання дадзеных з'яў;

– выявіць фанематычныя варыянты слоў, у якіх адбыліся якасныя змены нерэгулярнага характару ў складзе зычных, класіфікаваць іх і вызначыць пашырэнне ў беларускім дыялектным арэале;

– устанавіць фанематычныя варыянты слоў, у якіх адбыліся якасныя нерэгулярныя змены ў складзе галосных, сістэматызаваць іх і акрэсліць лакалізацыю ў беларускіх гаворках;

– высветліць умовы і прычыны рэалізацыі фанематычных варыянтаў квалітатыўна-дыстрыбутыўнага характару.

---

[1] Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: у 5 т. / Акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства; пад рэд. М.В. Бірылы, Ю.Ф. Мацкевіч. – Мінск: Беларус. фонд фундам. даслед.: Кам. дзярж. знакаў, 1993–1998. – 5 т.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Аб'ектам даследавання з'яўляецца фанетычная сістэма беларускай дыялектнай мовы. Прадмет даследавання – фанематычныя варыянты лексем, у якіх адбыліся функцыянальныя змены нерэгулярнага характару (больш за 2000 фіксацый). Крыніцай матэрыялу з'яўляюцца карты і каментарыі ЛАБНГ, з мэтай верыфікацыі асобных з'яў і арэалаў пашырэння выкарыстаны шэраг лексікаграфічных выданняў.

Нерэгулярныя фанетычныя з'явы займаюць адметнае месца ў фанетычнай сістэме беларускай дыялектнай мовы. На гэта пастаянна ўказваюць як матэрыялы рэгіянальных лексікаграфічных выданняў, так і многія працы па сістэмным апісанні асобных гаворак і беларускай дыялектнай мовы ў цэлым. Фанетычныя з'явы, якія аказваюцца па-за межамі заканамерных, узгадваліся ў працах Я.Ф. Карскага, П.А. Растаргуева, С.М. Некрашэвіча, П.А. Бузука, А.А. Крывіцкага і іншых навукоўцаў. Наяўнасць нерэгулярных з'яў была ўлічана пры складанні ЛАБНГ і іншых дыялектных слоўнікаў. Нягледзячы на гэта, праблема на сённяшні дзень з'яўляецца амаль не распрацаванай як у тэарэтычным плане (адсутнічаюць агульнапрынятая дэфініцыя тэрміна "нерэгулярная фанетычная з'ява", прынцыпы адбору і методыка апісання), так і ў плане комплекснага вывучэння вышэйназваных з'яў (не акрэслена кола фанетычных змен, якія ў беларускай дыялектнай мове адносяцца да нерэгулярных, няма сістэмнага і разгорнутага іх апісання). У сувязі з гэтым існуе неабходнасць манаграфічнага даследавання нерэгулярнай дыялектнай фанетыкі, у прыватнасці, патрэба тэарэтычнага асэнсавання праблемы, стварэння метадалогіі апісання, сістэматызацыі нерэгулярных з'яў на беларускім моўным матэрыяле і іх лінгвагеаграфічнага аналізу. Такое вывучэнне дапаможа ўдасканаліць апісанне рэгулярных з'яў беларускай фанетыкі, больш дакладна акрэсліць рэалізацыю фанетычных заканамернасцей у беларускай дыялектнай мове, прадэманструе сам механізм некаторых фанетычных працэсаў, і, магчыма, дазволіць высветліць некаторыя спрэчныя пытанні гістарычнай фаналогіі.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону.**

1. Нерэгулярныя фанетычныя з'явы ў беларускіх гаворках суіснуюць з рэгулярнымі з'явамі, складаюць неад'емную частку дыялектнай сістэмы, шырока прадстаўлены на ўсім беларускім моўным арэале і з'яўляюцца прычынай фанематычнай варыянтнасці лексічных адзінак у дадзенай моўнай сістэме. Непасрэднымі механізмамі ўзнікнення фанематычных варыянтаў можна назваць змены якаснага і колькасна-дыстрыбутыўнага характару. Функцыянальная сутнасць фанетычных інавацый з'яўляецца асновай апісання і класіфікацыі з'яў.

2. Найбольшай разнастайнасцю вылучаюцца нерэгулярныя фанетычныя з'явы якаснага характару ў сістэме кансанантызму, што з'яўляецца натуральным, улічваючы кансанантны характар беларускай мовы. Пры

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

рэалізацыі дадзеных з’яў фармальна адбываецца фанематычная дывергенцыя на аснове адной ці некалькіх функцыянальных прыкмет – артыкуляцыйных або акустычных. Змены могуць быць выкліканы фанетычнымі прычынамі (унутрымоўнымі і звязанымі з міжмоўным узаемадзеяннем) і нефанетычнымі.

3. Нерэгулярныя змены якаснага характару ў сістэме вакалізму характарызуюцца меншай разнастайнасцю. Фанематычная дывергенцыя абумоўлена трансфармацыямі старажытных і сучасных фанем, як правіла, у кірунку набыцця функцыянальнай прыкметы, блізкай да зыходнай па пад’ёме або радзе.

4. Квалітатыўна-дыстрыбутыўныя з’явы нерэгулярнага характару ў беларускай дыялектнай мове прадстаўлены такімі працэсамі, як пратэза, адпадзенне пачатковых фанем, эпентэза, дыярэза і розныя віды метатэзы. Для квалітатыўна-дыстрыбутыўных інавацый характэрны розныя ўмовы і прычыны рэалізацыі.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя з’яўляецца самастойным даследаваннем на падставе збору, сістэматызацыі і аналізу фактычнага матэрыялу, а таксама вывучэння прац, звязаных з адзначанай праблемай і апублікаваных айчыннымі і замежнымі даследчыкамі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэнні кафедры беларускага мовазнаўства УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка” (17 чэрвеня 2008 г.), а таксама на навуковым семінары праблемнага савета па філалагічных навуках названай установы (7 кастрычніка 2008 г.).

Асноўныя вынікі даследавання былі прадстаўлены ў навуковых дакладах Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Культура мовы і грамадства” (Мінск, 5–6 снежня 2002 г.), III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Асоба – слова – соцыум” (Мінск, 16–18 красавіка 2003 г.), VI Навуковых чытаннях, прысвечаных 120-годдзю з дня нараджэння акадэміка НАН Беларусі С.М. Некрашэвіча (Гомель, 23 мая 2003 г.), Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся” (Гомель, 20–21 мая 2004 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Па тэме дысертацыі апублікавана 10 работ агульным аб’ёмам 1,79 аўтарскага аркуша, з іх 3 артыкулы ў рэцэнзуемых перыядычных выданнях (0,8 аўтарскага аркуша), 5 – у зборніках навуковых прац (0,74 аўтарскага аркуша), 2 – у матэрыялах навуковых канферэнцый (0,25 аўтарскага аркуша).

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з пераліку ўмоўных абазначэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу, які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (225 найменняў) і спіс публікацый суіскальніка (10 найменняў).

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Агульны аб'ём даследавання складае 133 старонкі, 115 з іх займае асноўны тэкст, 19 – бібліяграфічны спіс.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваецца выбар тэмы дысертацыйнага даследавання, яго актуальнасць і ступень распрацаванасці ў сучасным мовазнаўстве.

**Першая глава** дысертацыі **"Нерэгулярныя фанетычныя з'явы ў метадалагічным аспекце"** падраздзяляецца на 4 раздзелы.

У **раздзеле 1.1** аналізуюцца працы па беларускай дыялекталогіі і гісторыі мовы 19 – першай паловы 20 ст. (Я.Ф. Карскага, П.А. Растаргуева, С.М. Некрашэвіча, П.А. Бузука і інш.), у якіх пастаянна сустракаюцца ўказанні на фанетычныя з'явы нерэгулярнага характару, што ахопліваюць змены ў націскным і ненаціскным вакалізме, а таксама ў кансанантызме. **Раздзел 1.2** прысвечаны сістэматызацыі лінгвістычнай літаратуры, у якой непасрэдна закранаюцца пытанні фанетычных змен і нерэгулярнай фанетыкі ў прыватнасці. З развіццём лінгвагеаграфіі праблема нерэгулярных з'яў узнікла ў сувязі з картаграфаваннем дыялектнага матэрыялу і была сфармулявана яшчэ М.С. Трубяцкім: "З тэрыторыяй, дзе даследаваная гукавая змена ажыццяўляецца паслядоўна, звычайна мяжуюць такія арэалы, дзе ў шэрагу слоў замест чаканай фанемы выяўляецца іншая і прычыну падобных "выключэнняў" устанавіць немагчыма. Непадалёк ад такіх тэрыторый знаходзяцца звычайна яшчэ іншыя, дзе гэтыя "выключэнні" ўжо выступаюць як "закон"[2]. Прыкладна з другой паловы 20 ст. ўжо стала агульнапрынятым меркаванне, што змены ў моўнай сістэме не заўсёды могуць адлюстроўваць абсалютнасць моўных законаў, а пытанне фанетычных змен увогуле пачало асвятляцца ў новых ракурсах. Цікавасць навукоўцаў непасрэдна да нерэгулярных з'яў у дыялектнай фанетыцы прыкметна ўзрасла ў 60 – 70-я гг. Першымі, хто на аснове фактычнага матэрыялу ўзняў пытанне пра нерэгулярныя фанетычныя з'явы, былі даследчыкі беларускіх гаворак заходняй зоны (А.І. Грынавецкене, Ф.Д. Клімчук, Ю.Ф. Мацкевіч і інш.). Адна з першых спроб размежаваць рэгулярныя і нерэгулярныя фанетычныя з'явы ў беларускай дыялекталогіі (у тэрміналогіі аўтара пазіцыйныя і функцыянальныя) была зроблена А.А. Крывіцкім[3]. Найбольш значным дасягненнем усходнеславянскай дыялекталогіі ў вывучэнні нерэгулярных фанетычных з'яў варта лічыць

---

[2] Трубецкой, Н.С. Фонология и лингвистическая география / Н.С. Трубецкой // Избранные труды по филологии. – М.: Наука, 1987. – С. 31 – 36.

[3] Крывіцкі, А.А. Практыкум па фанетыцы беларускай мовы / А.А. Крывіцкі, А.І. Падлужны. – Мінск: Вышэйшая школа, 1989. – С. 135.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

манаграфію В.Д. Кузняцовай[4], прысвечаную аналізу нерэгулярных фанетычных з'яў у рускай дыялектнай мове. У **раздзеле 1.3** вырашаецца метадалагічная праблема суаднясення тэрмінаў "нерэгулярная фанетычная з'ява" і "лексікалізаваная фанетычная з'ява", паколькі ў некаторых працах дадзеныя тэрміны выступаюць як дублетныя. Аналізуюцца погляды А.А. Рэфармацкага, Ф.П. Філіна, В.Д. Кузняцовай і інш. На аснове аналізу прац і ўласных назіранняў робіцца вывад, што нерэгулярныя фанетычныя з'явы ў цэлым – паняцце значна шырэйшае, чым лексікалізацыя, якая па сутнасці з'яўляецца другасным працэсам, калі фанематычны варыянт слова замацоўваецца ўжо на лексічным узроўні. У **раздзеле 1.4** асвятляецца праблема вызначэння тэрміна "нерэгулярная фанетычная з'ява". Адзначаюцца погляды на фанетычныя чаргаванні, прыведзеныя ў лінгвістычных даведніках і працах айчынных і замежных навукоўцаў 20 – 21 ст. Абгрунтоўваецца выбар тэрміна "нерэгулярная фанетычная з'ява" з ліку існуючых у сучасным моваэнаўстве найменняў "нерэгулярнае фанетычнае чаргаванне", "лексікалізаваная з'ява", "спарадычная змена", "функцыянальная змена", прапануецца наступная дэфініцыя: нерэгулярныя фанетычныя з'явы – гэта гукавыя мадыфікацыі, зафіксаваныя на функцыянальным узроўні, якія не з'яўляюцца пазіцыйнымі чаргаваннямі ў дадзенай дыялектнай сістэме, г. зн. характарызуюцца адсутнасцю пазіцыйнай дэтэрмінаванасці ў пэўным сінхронным зрэзе. **Раздзел 1.5** прысвечаны методыцы выяўлення і класіфікацыі нерэгулярных фанетычных з'яў. Асноўным метадалагічным арыенцірам працы з'яўляецца вучэнне Пражскай лінгвістычнай школы аб сістэмным падыходзе да эвалюцыі мовы. Такі падыход уключае ў сябе ўяўленне аб мове як дынамічнай сістэме, ў развіцці якой прысутнічае проціборства тэндэнцый, што не дазваляе моўнай сістэме дасягнуць абсалютнай устойлівасці. Распрацоўка методыкі была здзейснена паводле наступных прынцыпаў: функцыянальнага і лінгвагеаграфічнага. У сувязі з функцыянальным прынцыпам сцвярджаецца, што нерэгулярная фанетычная з'ява, як і з'ява фанетычнага закону, мае месца пры наяўнасці толькі гукавой змены, а не чаргавання гукаў. На гэтай падставе для даследавання выбраны прыклады, дзе прысутнічаюць відавочныя змены ў фанемным складзе і выключаецца чаргаванне алафонаў. Для аналізу адбіраліся пары фанематычных варыянтаў – слоў, дзе фанемы знаходзяцца ў сігніфікатыўна моцнай пазіцыі. У асобных выпадках сустракаюцца прыклады змен у слабай пазіцыі, калі ўвесь папярэдні матэрыял дазваляе гаварыць аб незалежнасці дадзенай з'явы ад пазіцыі ў слове. З гэтай прычыны па-за межамі працы засталіся з'явы ненаціскнога вакалізму, за выключэннем тых выпадкаў, калі з ненаціскнымі галоснымі звязаны змены ў колькасным складзе слова,

[4] Кузнецова, О.Д. Актуальные процессы в говорах русского языка: лексикализация фонетических явлений / О.Д. Кузнецова. – Ленинград: Наука, 1985. – 181с.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

*крапіва́ – пакрыва́* і інш. У літаратурнай мове замацаваны асобныя вынікі нерэгулярнай пратэзы: *апалонік, рэха* [2, 3, 6, 7].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Вынікі дысертацыйнага даследавання будуць садзейнічаць як тэарэтычнаму асэнсаванню і практычнаму вывучэнню нерэгулярных фанетычных з'яў, так і больш глыбокаму разуменню рэгулярных змен, што адбываюцца ў фанетычнай сістэме беларускай нацыянальнай мовы. Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны:

1) пры лінгвагеаграфічным і тыпалагічным вывучэнні фанетычных працэсаў ў славянскіх і неславянскіх мовах;
2) у этымалагічных даследаваннях;
3) пры ўкладанні лексікаграфічных даведнікаў;
4) пры стварэнні рэгіянальных атласаў;
5) пры складанні праграм па вывучэнні беларускіх народных гаворак;
6) пры напісанні вучэбных дапаможнікаў па фанетыцы і фаналогіі беларускай мовы для студэнтаў філалагічных факультэтаў.

Асноўныя вынікі і матэрыялы дысертацыі мэтазгодна выкарыстоўваць пры чытанні курсаў "Беларуская дыялекталогія", "Гістарычная граматыка беларускай мовы", "Сучасная беларуская літаратурная мова", правядзенні спецкурсаў і спецсемінараў, напісанні дыпломных і курсавых прац у ВНУ Рэспублікі Беларусь.

Асноўныя палажэнні дысертацыі адлюстраваны ў наступных публікацыях:

## Артыкулы ў рэцэнзуемых перыядычных выданнях

1. Забаштанская, А.І. Адлюстраванне нерэгулярных фанетычных з'яў у працах па беларускай дыялекталогіі канца 19 – пачатку 20 ст. / А.І. Забаштанская // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. – 2005. – № 4. – С. 74– 76.

2. Забаштанская, А.І. Метатэза ў беларускай дыялектнай мове / А.І. Забаштанская // Род. слова, 2005. – № 12. – С. 36–38.

3. Забаштанская, А.І. Колькасныя змены галосных нерэгулярнага характару ў беларускай дыялектнай мове / А.І. Забаштанская // Род. слова. – 2008. – № 9. – С. 58–60.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

### Артыкулы ў зборніках навуковых прац

4. Забаштанская, А.І. Да праблемы вывучэння нерэгулярных фанетычных з'яў у беларускіх гаворках / А.І. Забаштанская // Актуальныя пытанні беларускай лінгвістыкі (да 80-годдзя прафесара М.С. Яўневіча): зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т; рэдкал.: П.А. Міхайлаў [і інш.]. – Мінск, 2002. – С. 68–71.

5. Забаштанская, А.І. Да пытання аб нерэгулярных фанетычных з'явах у беларускай дыялектнай мове / А.І. Забаштанская // Актуальныя пытанні сучаснай навукі: да 80-годдзя БДПУ: зб. навук. прац: у 2 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т; рэдкал.: А.Ф. Рацько (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2002. – Ч. 2. – С. 90–92.

6. Забаштанская, А.І. Пратэза як нерэгулярная фанетычная з'ява ў беларускай дыялектнай мове / А.І. Забаштанская // VI Навуковыя чытанні, прысвечаныя 120-годдзю з дня нараджэння акадэміка НАН Беларусі С.М. Некрашэвіча: зб. навук. арт. / Гомел. дзярж. ун-т; рэдкал.: А.А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2003. – С. 135–137.

7. Забаштанская, А.І. З'ява эпентэзы ў беларускіх гаворках / А.І. Забаштанская // Актуальныя пытанні сучаснай навукі: зб. навук. прац: у 2 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т; рэдкал.: А.Ф. Рацько (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2004. – Ч. 1. – С. 187–188.

8. Забаштанская, А.І. Нерэгулярныя фанетычныя з'явы і лексікалізацыя як аб'ект вывучэння дыялектнай фанетыкі / А.І. Забаштанская // Слово в культуре: сб. науч. ст.: в 2 ч. / Гомел. гос. ун-т; редкол.: В.А. Бобрик [и др.]. – Гомель, 2004. – Ч. 1. – С. 30–34.

### Матэрыялы навуковых канферэнцый

9. Забаштанская, А.І. Пашырэнне выбухнога *g* у беларускай дыялектнай мове / А.І. Забаштанская // Культура мовы і грамадства: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 5–6 снеж. 2002 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т; рэдкал.: П.А. Міхайлаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2002. – С. 62–63.

10. Забаштанская, А.І. Змяшэнне некаторых губных у дыялектнай мове / А.І. Забаштанская // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гомель, 20–21 мая 2004 г.: у 2 ч. / Гомел. дзярж. ун-т; рэдкал.: А.А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2004. – Ч. 2. – С. 27–29.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## РЭЗЮМЭ

**Забаштанская Аксана Ігараўна**

# НЕРЭГУЛЯРНЫЯ ФАНЕТЫЧНЫЯ З'ЯВЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯЛЕКТНАЙ МОВЕ

**Ключавыя словы:** фанема, гук, фанематычны варыянт, фанематычная дывергенцыя, фанетычная змена, якасная змена, колькасна-дыстрыбутыўная змена, функцыянальная прыкмета, лексікалізацыя, свабоднае вар'іраванне.

**Аб'ект даследавання** – фанетычная сістэма беларускай дыялектнай мовы.

**Прадмет даследавання** – фанематычныя варыянты лексем, у якіх адбыліся функцыянальныя змены нерэгулярнага характару.

**Мэта даследавання** – сістэматызаваць і апісаць нерэгулярныя фанетычныя з'явы ў беларускай дыялектнай мове.

**Метады даследавання –** апісальны, арэальны, параўнальна-гістарычны, элементы колькаснага падліку.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў** заключаецца ў тым, што ўпершыню ў айчынным моваазнаўстве на багатым фактычным матэрыяле, выяўленым у лінгвагеаграфічных і лексікаграфічных крыніцах, даследавана праблема нерэгулярных фанетычных з'яў як складанай комплекснай падсістэмы дыялектнай мовы. Нерэгулярныя фанетычныя з'явы беларускай дыялектнай мовы апісаны на аснове функцыянальнага падыходу, упершыню праведзена іх сістэматызацыя, прааналізаваны прычыны ўзнікнення асобных з'яў, паказана іх тэрытарыяльная лакалізацыя.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны для лінгвагеаграфічнага і тыпалагічнага вывучэння фанетычных працэсаў ў славянскіх і неславянскіх мовах, этымалагічных даследаваннях, укладанні лексікаграфічных даведнікаў, напісанні вучэбных дапаможнікаў па фанетыцы і фаналогіі беларускай мовы для ВНУ Рэспублікі Беларусь. Матэрыялы дысертацыі мэтазгодна выкарыстоўваць пры чытанні курсаў "Беларуская дыялекталогія", "Гістарычная граматыка беларускай мовы", "Сучасная беларуская літаратурная мова", правядзенні спецкурсаў, спецсемінараў, напісанні дыпломных і курсавых прац.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## РЕЗЮМЕ


**Забаштанская Оксана Игоревна**

**НЕРЕГУЛЯРНЫЕ ФОНЕТИЧЕСКИЕ ЯВЛЕНИЯ В БЕЛОРУССКОМ ДИАЛЕКТНОМ ЯЗЫКЕ**

**Ключевые слова:** фонема, звук, фонематический вариант, фонематическая дивергенция, фонетическое изменение, качественное изменение, количественно-дистрибутивное изменение, функциональный признак, лексикализация, свободное варьирование.

**Объект исследования** – фонетическая система белорусского диалектного языка.

**Предмет исследования** – фонематические варианты лексем, в которых произошли функциональные изменения нерегулярного характера.

**Цель исследования** – систематизировать и описать нерегулярные фонетические явления в белорусском диалектном языке.

**Методы исследования** – описательный, ареальный, сравнительно-исторический, элементы количественного подсчета.

**Научная новизна и значимость полученных результатов** заключается в том, что впервые в отечественном языкознании на богатом фактическом материале, выявленном в лингвогеографических и лексикографических источниках, исследована проблема нерегулярных фонетических явлений как сложной комплексной подсистемы диалектного языка. Нерегулярные фонетические явления белорусского диалектного языка описаны на основе функционального подхода, впервые проведена их систематизация, проанализированы причины возникновения некоторых явлений, показана их территориальная локализация.

**Практическая значимость полученных результатов.** Результаты диссертационного исследования могут быть использованы для лингвогеографического типологического изучения фонетических процессов в славянских и неславянских языках, этимологических исследованиях, составлении лексикографических справочников, написании учебных пособий по фонетике и фонологии для ВУЗов Республики Беларусь. Материалы диссертации станут полезными также при чтении курсов “Белорусская диалектология”, “Историческая грамматика белорусского языка”, “Современный белорусский язык”, проведении спецкурсов, спецсеминаров, написании дипломных и курсовых работ.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## SUMMARY

**Zabashtanskaya Axana Iharauna**

## IRREGULAR PHONETIC PHENOMENA IN BELARUSIAN DIALECT LANGUAGE

**Key words:** phoneme, sound, phonemic variant, phonemic divergence, phonetic change, quality change, quantitative-distributive change, functional sign, lexicalization, free variability.

**The object of the research:** the phonetic system of Belarusian dialect language.

**The subject of the research:** the phonemic variants of lexemes where irregular functional changes took place.

**The purpose of the research:** to systematize and describe irregular phonetic phenomena in Belarusian dialect language.

**The methods of the research:** descriptive, the method of area analysis, comparative historical method as well as the elements of quantitative calculation.

**The scientific novelty and the importance of the results received** is in the fact that for the first time in the home linguistics, using rich factual material from linguageographical and lexicographic sources the problem of irregular phonetic phenomena was raised as complex subsystem of the dialect language. The irregular phonetic phenomena in Belarusian dialect language on the basis of functional approach was done; for the first time the phenomena were systematized, causes of appearance of some phenomena and their regional localization were analyzed.

**The practical value of the results received:** the materials and the results of the research can be used for linguageographical and typological research of phonetic processes in Slavonic and other languages. The observations and the results presented in this work will be of great help for etymological research, while compiling dialect dictionaries, linguistic reference books, writing textbooks on phonetics and phonology for higher education establishments of the Republic of Belarus. The materials of the research will also be useful in the process of teaching Belarusian dialectology course, as well as the course of historical grammar of Belarusian language, course of modern Belarusian literary language, while compiling special courses and in writing course and diploma works.



Падпісана да друку 19.11.2008. Фармат 60х84 1/16 Бумага афсетная. Гарнітура Roman.
Друк цыфравы. Ум.др.л. 1,3. Уч.выд.л. 1,4. Тыраж 60 экз. Заказ № 671.
ВТАА «Права і эканоміка» Ліцэнзія ЛІ № 02330/0056831 ат 01.04.2004.
220072 Мінск Сурганава 1, корп. 2. Тэл. 284 18 66, 8 029 684 18 66.
Надрукавана на настольна-выдавецкай сістэме XEROX ВТАА «Права і эканоміка»